*Магнацкі двор і сацыяльнае ўзаемадзеянне (XV–XVIII стст.): зборнік навуковых прац / Пад рэд. А. М. Янушкевіча. Мінск, 2014.*

*Вольга Гарбачова*

# Баўленне вольнага часу шляхтай Вялікага княства Літоўскага ў канцы XVIII ст. (на прыкладзе роду Рэйтанаў)

Штодзённае жыццё ў Вялікім княстве Літоўскім у XVIII ст. уяўляе сабой пэўныя мадэлі паводзін, сфармаваныя адпаведнымі сацыяльнымі групамі. Трэба адзначыць, што гэтыя мадэлі існавалі ізалявана, яны паўстаюць у адпаведнасці з панаваўшымі ўяўленнямі аб адрозненнях у паходжанні людзей, разуменні іх месца ў грамадстве, рэлігійнай сітуацыі, этычнымі імператывамі і эстэтычнымі нормамі, то бок той сістэмы каштоўнасцяў, якая вызначала прызначэнне чалавека і стыль ягонага жыцця. На гэты час можна казаць аб існаванні шляхецкай, святарскай, мяшчанскай, сялянскай і маргінальнай мадэляў, якія ўключаюць у сябе маральны кодэкс, лад жыцця і стыль паводзін, манеру апранацца і харчавацца, а таксама асаблівасці баўлення вольнага часу.

Кожная з вызначаных сістэм мае свой ўнутраны падзел, які адпавядае стратыфікацыі грамадства. Як і іншыя станы, шляхта не з'яўлялася аднароднай. Пры наяўнасці такіх агульных складнікаў, як «атрыманне асалоды ад паўсядзённага»[1], зацікаўленасці да інтэлектуальнай сферы і гістарычнай спадчыны, вылучэнне сямейных каштоўнасцяў, арыентацыя на «старапольскія» звычаі і генеалагічныя традыцыі, паводзіны ў вольны час магната, заможнага шляхціца і рэзідэнта ў значнай ступені адрозніваюцца.

Сістэму паводзін у вольны час заможнай шляхты мажліва прасачыць

[1] Rolnik D. Portret szlachty czasów stanisławowskich, epoki kryzysu, odrodzenia i upadku Rzeczypospolitej w pamiętnikach polskich. Wydanie drugie. Katowice, 2011. S. 54.

© В. Гарбачова

на прыкладзе прадстаўнікоў прускага роду Рэйтанаў, адна з ліній якога асядае на беларуска-літоўскіх землях з XVII ст.[2] У XVIII ст. з прадстаўнікоў роду вылучаецца Дамінік Рэйтан, уласнік маёнтка Грушаўка[3] і зямель на Капыльшчыне. Па сваёй службе ён быў звязаны з родам Радзівілаў. Першапачаткова з'яўляўся афіцыялістам Ганны Радзівіл, а надалей служыў ў Міхала Казіміра і Караля Радзівілаў. Значную ролю Дамінік Рэйтан адыгрываў у працы Наваградскага сойміка. У 1765 г. ён быў абраны наваградскім стольнікам, затым наваградскім падкаморыем. У шлюбе з ВеранікайВаладковіч ён меў 5 сыноў: Міхала, Тадэвуша (1742–1780 гг.), удзельніка гістарычнага сойма 1773–1775 гг., Юзафа[4], Антонія і Станіслава[5], а таксама трох дачок – Канстанцыю, Марыяну і Ганну[6].

Унучка Дамініка Рэйтана, дачка яго сына Міхала, наваградскага земскага пісара, слуцкага харужага і нясвіжскага павятовага маршалка[7], Ганна Рэйтан, у шлюбе Герыч, занатавала ва ўспамінах перыяд свайго жыцця

[2] Uruski S. Rodzina. Herbarz szlachty polskiej. Reprint. T. 15. Bielsko-Biała, 2003. S. 206.

[3] Першым уласнікам Грушаўкі (Наваградскі павет) быў Марцін Рэйтан, які перадаў яе сыну Міхалу Казіміру Рэйтану. У 1706 г. маёнтак адпаведна з тэстаментам апошняга ад 14 лістапада 1705 г. адышоў да яго сына Дамініка. У 1778 г. Грушаўка перайшла ва ўласнасць Станіслава і Антонія Рэйтанаў, сыноў Дамініка. Мацей Мыцельскі лічыць, што падзел маёнткаў паміж сынамі Дамініка Рэйтана адбыўся ў 1769 г. У 1788 г., пасля смерці Антонія, яго спадчынная частка пераходзіць да брата Міхала Рэйтана. Гл.: Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ), ф. 319, воп. 2, спр. 2716, арк. 16–16 адв., 25–25 адв. Справа Менскага дваранскага дэпутацкага сходу аб дваранскім паходжанні Рэйтанаў; Aftanazy R. Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej. T. 2. Województwa nowogródzkie, brzesko-litewskie. Wrocław, 1993. S. 219–220; Mycielski M. Reytan Michał // Polski Słownik Biograficzny (далей – PSB). T. XXXI. Wrocław, 1988. S. 230–231.

[4] Юзаф Рэйтан – сын Дамініка Рэйтана і Тэрэзы Валадковіч, першы муж Людвікі Касінскай. Падчас падзелу Дамінікам Рэйтанам у 1778 (1769 (?)) г. сваіх маёнткаў паміж сынамі, Юзафу яго частка была выплачана грашыма ў колькасці 80 тыс. злотых. Гл.: Федорук А. Т. Старинные усадьбы Берестейщины. С. 23.

[5] Станіслаў Рэйтан – малодшы сын Дамініка Рэйтана і Тэрэзы Валадковіч, які ў 1778 (1769 (?)) г. стаў саўладальнікам разам з братам Антоніем маёнтка Грушаўка. Акрамя гэтага, Станіславу дасталіся яшчэ два маёнткі ў Наваградскім павеце, адным з якіх былі Мазуркі. Гл.: Федорук А. Т. Старинные усадьбы Берестейщины. С. 23.

[6] Mycielski M. Reytan Dominik // PSB. T. XXXI. S. 230; Uruski S. Rodzina. Herbarz szlachty polskiej. T. 15. S. 206.

[7] На пасаду маршалка Міхал Рэйтан быў абраны ў 1795 г. Гл.: НГАБ, ф. 319, воп. 2, спр. 2716, арк. 23, 37.

ў маёнтку Грушаўка, што прыпадае на канец XVIII – пачатак XIX ст.[8]

Галоўнае месца ў штодзённым жыцці шляхты займалі святы, дзе назіраецца спалучэнне свецкіх і рэлігійных традыцый. Для асобнага чалавека на першае месца вылучаецца святкаванне іменінаў. Свята нябеснага патрона, у гонар якога прысвойвалася імя чалавеку, было вядома ўсім. Гэта аб'ядноўвала ўсіх вернікаў, а разам з тым пакідала нейкую надзею на казачнасць, цуда, а таксама выпадковасць у з'яўленні нечаканых гасцей. Так, Ганна Герыч сведчыць, што «імяніны … бабці … прыходзіліся на 26 чэрвеня, дзень святой Ганны … гасцей збіралася шмат і прыбывалі яны часам на працягу двух ці трох дзён»[9]. Само свята магло адзначацца на працягу тыдня і болей. Для XVII–XVIII стст. увогуле не існавала разумення марнай страты часу. Увесь час пад'язджалі новыя госці. Дом у Грушаўцы, дзе ладзіліся імяніны, быў двухпавярховы і дастаткова вялікі. Складана вызначыць, якая колькасць гасцей збіралася на святы, але вядома, што ў звычайныя дні ў Рэйтанаў за стол сядала разам з членамі сям'і не меней за пятнаццаць-дваццаць чалавек[10].

Распачыналіся імяніны касцёльнымі ўрачыстасцямі. Далейшая праграма складалася з традыцыйных формаў баўлення часу – застолля, танцаў і розных забаў. Цэнтральнае месца адводзілася застоллю, дзе госці прамаўлялі ў гонар імянінніка. У XVII – першай палове XVIII ст. прамова яшчэ суправаджалася абрадам «абвязвання пасам», калі прамоўца вязаў імянінніка рознымі сродкамі (пасам, хусткай, стужкай і г. д.) для дэманстрацыі сяброўскай повязі і еднасці. Паступова гэты звычай замяняецца на падарунак, які ўспрымаўся сімвалам «абвязвання».

Традыцыйным элементам сямейных застолляў застаецца спажыванне алкаголю. У XVII–XVIII стст. у шляхецкім асяродку гэта разглядалася як свайго роду абавязак, адмова ад якога магла прывесці да непрыязні і страты павагі ад суседзяў па застоллю, а нават і з боку знаёмых. Аднак на канец XVIII ст. тут можна прасачыць пэўныя змены. Вядомыя па нататках

8 Гл.: З успамінаў Ганны Герыч з Рэйтанаў, якая памерла ў Парыжы ў 1857 годзе / Гарбачова В. Ганна Герыч і яе ўспаміны // Асоба і час. Беларускі біяграфічны альманах. Выпуск 1. Мінск, 2009. С. 96–116. Польскамоўная версія: Z pamiętników Anny z Rejtenów Geryczowej, zmarłej w Paryżu roku 1857 // Dziennik Literacki. № 133–137. Lwów, 1857; Z pamiętników Anny z Rejtenów Gieryczowej zmarłej w Paryżu roku 1857. Lwów, 1858.

9 З успамінаў Ганны Герыч з Рэйтанаў, якая памерла ў Парыжы ў 1857 годзе. С. 106.

10 Тамсама. С. 97.

Е. Кітовіча прымусы да піцця ажно да страты прытомнасці[11] як праявы сармацкай культуры паступова адыходзяць у мінулае. Гэта ж тычыцца дужых келіхаў, традыцыі іх хуткага напаўнення і бязмернага спажывання алкаголю. Паступова ў гэтай сферы замацоўваецца стрыманасць, а атракцыйнасць замяняецца разнастайнасцю прапанаваных гасцям напояў. Зразумела, што згаданыя змены адбываюцца не паўсюдна. Старыя звычаі маглі сустракацца і ў дастаткова адукаваным асяроддзі. Але ў такіх выпадках значную ролю адыгрываў менавіта склад гасцей і мэта, з якой яны збіраліся. Уільям Кокс, які наведаў Рэч Паспалітую напрыканцы 70-х гг. XVIII ст., згадваў выпадак, які адбыўся ў А. Тызенгаўза падчас збору мясцовай шляхты перад соймікам. Падарожнік быў ўражаны значнай колькасцю і хуткасцю выпітага ў застоллі[12]. Тым не менш на сямейным узроўні змены заўважаліся. У тых жа Рэйтанаў падчас святаў падавалі гасцям «настойку з палыні, з памаранча, жоўтую, белую цукроўку»[13], пра наяўнасць жа на святах нецвярозых нават не ўзгадваецца.

Пэўным чынам змяняецца і афарбоўка святаў. Па сведчанню мемуарных крыніц, яго неад'емнымі элементамі становяцца танцы і музыка. І калі ў шляхецкіх маёнтках танцы маглі часткова замяняцца нейкімі забавамі, то музыка гучала заўсёды[14]. Тым не менш на канец XVIII ст. музыка па-ранейшаму выконвала забаўляльную функцыю і ўспрымалася ў якасці лёгкай забавы.

Заможная шляхта магла наймаць прафесійных музыкаў, звяртацца да вандроўных артыстаў ці выкарыстоўваць здольнасці сваіх падданых. Так, у Рэйтанаў, «…калі гасцям хацелася ўпрыгожыць свой вечар, прыносіў Каролік сваю маленькую арфачку і пачынаў граць, спяваючы розныя песні»[15]. Утрыманне ўласнай капэлы для гэтай шляхецкай групы было непамерна дарагім, што маглі дазволіць сабе толькі прадстаўнікі магнатэрыі. Так, Станіславу Любамірскаму ўтрыманне ўласнага хору з пятнаццаці чалавек у сярэдзіне XVII ст. каштавала столькі, колькі сто пешых салдатаў

11 Kitowicz J. Opis obyczajów za panowania Augusta III. Warszawa, 1985. S. 235–236.

12 Coxe W. Podróż po Polsce // Polska stanisławowska w oczach cudzoziemców. T. 1. Warszawa, 1963. S. 691–692.

13 З успамінаў Ганны Герыч з Рэйтанаў, якая памерла ў Парыжы ў 1857 годзе. С. 106.

14 Kaczyński P. Od pijatyki do fête galante. Formy zabawy na dworach magnackich w XVIII wieku // Dwory magnackie w XVIII wieku. Rola i znaczenie kulturowe / Pod red. T. Kostkiewiczowej i A. Roćko. Warszawa, 2005. S. 71.

15 З успамінаў Ганны Герыч з Рэйтанаў, якая памерла ў Парыжы ў 1857 годзе. С. 102.

у войску[16]. Для размяшчэння музыкаў у залі вылучаўся спецыяльны кут. Буйная шляхта для гэтых мэтаў будавала ці спецыяльныя прыступкі, ці нават асобныя галерэі[17].

Заможная шляхта імкнулася нейкім чынам вылучыцца на ўзроўні арганізацыі забаў, што ў пэўнай ступені з'яўлялася прыцягальным для гасцей. У Рэйтанаў быў карлік Каролік. Мода на ўтрыманне карлікаў у ВКЛ з'яўляецца ў першай палове XVI ст. На той час дазволіць сабе такую раскошу маглі толькі каралеўскія сем'і і буйнейшыя магнаты[18]. Карлікаў выкарыстоўвалі ў якасці блазнаў. Пад уплывам асветніцкіх ідэй дадзеная традыцыя пэўным чынам трансфармуецца. Карлікаў пачынаюць разглядаць як нейкае выключэнне, а пры наяўнасці асабовых здольнасцяў выкарыстоўваць у якасці артыстаў. У дадзеным выпадку такія выступы можна паставіць на адзін узровень з танцамі экспрэсіўных казакоў ці балетных труп[19].

Падчас святаў у Рэйтанаў карлік, акрамя выканння абавязкаў лёкая (у яго абавязкі ўваходзіла абносіць гасцей алкагольнымі напоямі), павінен быў дэманстраваць розныя здольнасці. У такія дні ён апранаў «кунтуш светла-папялістага колеру (бо, калі адбываліся ў доме ўрачыстасці, хадзіў па-польску), жупан быў на ім жоўтага колеру, а падпаясаны быў шаўковым рознакаляровым пасам з залатой ніткай, купленым у Слуцку... Штодзённа Каролік хадзіў у сурдуціку цёмна-сіняга колеру, у чырвонай камізэльцы з залатымі гузікамі, а дакладней кажучы — з пазалочанымі»[20]. Трэба адзначыць, што папярэдняя ўласніца Кароліка дала яму пэўную адукацыю: карліка навучылі чытаць, пісаць і лічыць, «акрамя гэтага, … граць на арфе і спяваць»[21]. Атрымаў ён і рэлігійную адукацыю, таму яго выкарыстоўвалі падчас імшы.

Адукаваныя і здольныя карлікі былі выключнай з'явай у ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Вялікай папулярнасцю карысталіся спатканні ў папярэдняй уладальніцы Кароліка княжны Салагуб у Варшаве. Карлік «з'яўляецца

[16] Bockenheim W. Dworek, kontusz, karabela. Wrocław, 2002. S. 79.

[17] Czapliński W., Długosz J. Życie codzienne magnaterii polskiej w XVII w. Warszawa, 1982. S. 121.

[18] Бохан Ю., Скеп'ян А. Побыт феадалаў Вялікага Княства Літоўскага ў XV – сярэдзіне XVII стагоддзя. Мінск, 2011. С. 247.

[19] Kaczyński P. Od pijatyki do fête galante. Formy zabawy na dworach magnackich w XVIII wieku. S. 80.

[20] З успамінаў Ганны Герыч з Рэйтанаў, якая памерла ў Парыжы ў 1857 годзе. С. 106.

[21] Тамсама. С. 101.

аб’ектам бязмежнай любові ўсяго варшаўскага свету»[22]. Паміж Рэйтанамі і Салагубамі нават была распачата судовая справа па вяртанню прыгоннага Кароліка.

Каштоўнасць карліка падкрэслівае яшчэ адзін момант. Міхал Рэйтан, адстаяўшы сваю ўласнасць, падараваў карліка ў дзень шлюбу сваёй жонцы разам з завушніцамі з дыяментамі, вялікім пярсцёнкам і ангельскай карэтай. А ў далейшым, пазбавіўшыся свайго маёнтка, нават даў Кароліку вольную, каб той не перайшоў новаму ўласніку.

Між тым, карлік здзіўляў гасцей не толькі сваімі музычнымі здольнасцямі. Ён мог павесяліць гасцей, паказваючы розныя фокусы. Наколькі можна зразумець, ён меў сталы рэпертуар, які, нягледзячы на абмежаванасць, карыстаўся попытам з году ў год. Так, Герыч пераказвае фокус з сабакам, памяць пра які яна пранесла на працягу трыццаці гадоў: «Быў у яго (Кароліка) пярэсты сабака па мянушцы Ламорэк, які цудоўна прыкідваўся мёртвым. Для забавы, калі Каролік быў у добрым настроі, ён выклікаў Ламорэка на сярэдзіну пакоя і звяртаўся да яго:

— Здох сабака!

Пасля гэтага сабака выцягваў лапы і ляжаў, як нежывы. А Каролік працягваў каментар:

— Здох сабака! Шкада сабаку! Што гэта быў за сабака!... Падлятала аса да носа, вуха сабакі. Нічога не адбываецца, здох сабака! Пpыляцеў крумкач, пачаў сабаку кляваць, стук, стук. Нічога. Памёр сабака. Нарэшце прыехаў хтосьці і паведаміў штосьці, ужо нават не ведаю менавіта пра што, але раптоўна саскоквае сабака, а ўсе з вялікай радасцю і смехам усклікваюць:

— Жывы сабака! Жывы сабака!

Трэба было мець пачуццё гумару і такога добрага сабаку, каб паказваць такія нумары, бо Ламорэк нікога не слухаў, акрамя свайго гаспадара, і калі хто чужы таксама загадваў яму, каб ён здох, пачынаў гыркаць і паказваў зубы. Усе, пачынаючы ад мяне, яго баяліся, і, як памятаю, казалі:

— Які злосны гэты Ламорэк»[23].

Звычайнай на хатніх святах была гульня ў карты. У XVIII ст. яна ўжо не праследавалася, як гэта было ў папярэднія стагоддзі. Пастулова карты распаўсюджваюцца па-за межы вялікакняскага двара, захопліваюць магнатэрыю, а затым усё шляхецкае асяроддзе, а таксама хатнюю прыслугу. Захаваліся прыклады, што гульнёй у карты пачыналі бавіцца з адзінаццацігадовага ўзросту, а некаторым лёкаям гульня перашкаджа-

[22] Тамсама. С. 102.
[23] Тамсама. С. 103.

ла нават у нясенні службы[24]. Не грэбавалі гэтым заняткам і жанчыны. У выніку карты становяцца сталай формай правядзення вольнага часу розных станаў і ўзроставых груп.

У карты гулялі як на хатніх святах, так і падчас візітаў. Па ўспамінах Е. Кітовіча, у часы Аўгуста III былі распаўсюджаны такія віды картачных гульняў, як «пікет», «хапанка» і «купец», вядомыя з папярэдніх стагоддзяў. Аднак напрыканцы XVIII ст. з-за сваёй складанасці і неабходнасці ведання правілаў гульні яны ўжо не карысталіся вялікім попытам. Больш папулярнымі становяцца такія простыя гульні, як «рус» і «трышак». Так, у «руса» неабходна было сабраць тры старэйшыя карты, а ў «трышака» – тры карты адной вартасці[25]. У гэтыя гульні гулялі як на грошы, так і на інтарэс.

Па сведчанню Ганны Герыч, у асяроддзі Рэйтанаў былі распаўсюджаны азартныя гульні. У сваіх успамінах аўтарка згадвае пра бытаванне высокіх ставак у картачных гульнях. У гэтым выпадку размова можа ісці пра папулярную ва ўсёй Еўропе ў канцы XVIII – пачатку XIX ст. гульню французскага паходжання «фараон»[26], якая атрымала сваю назву ад выявы фараона на паверху карткі.

Пачаткова калода для гэтай гульні складалася з 36 картаў, гулялі ў яе адначасова па два чалавекі. Перад гульнёй супернікі рабілі стаўкі. Кожнаму гульцу выдавалася па чатыры карты, а астатнія клаліся на сярэдзіну стала. Пакладзеную на стол карту патрэбна было закрыць адпаведна правілаў, пры адсутнасці неабходнай карты гульцы карысталіся калодай. Гульня ішла да таго моманту, пакуль адзін з гульцоў не набіраў 100 пунктаў. У такім выпадку ён лічыўся прайграным і супернік забіраў пастаўленыя на гульню грошы. У працэсе эвалюцыі правілы гульні і колькасць яе ўдзельнікаў змяняліся[27].

Е. Кітовіч падае апісанне іншага варыянту гэтай гульні. На стол выкладаліся тварам уверх трынаццаць карт адной масці. Гульнёй запраўляў банкамёт, які трымаў дзве калоды картаў. Гульцы маглі рабіць стаўкі на адну ці некалькі выкладзеных на стол картаў. Пасля гэтага банкамёт пачынаў кідаць карты. Кожны раз, выклаўшы дзве карты, ён спы-

[24] Bystroń J. S. Dzieje obyczajów w dawnej Polsce. Wiek XVI–XVIII. Wyd. trzecie. T. II. Warszawa, 1976. S. 205.

[25] Kitowicz J. Opis obyczajów za panowania Augusta III. S. 360–361.

[26] «Фараон» пачынае распаўсюджвацца ў Рэчы Паспалітай з часоў кіравання Аўгуста III. Гл.: Bystroń J. S. Dzieje obyczajów w dawnej Polsce. S. 207.

[27] Фараон (игра) [Электронный ресурс]. Режим доступа: http://megabook.ru/article. Дата доступу: 20.06.2013.

няецца. І пакуль не выйдуць запар дзве аднолькавыя карты, вынік быў невядомы. Калі ж выйшлі дзве карты, на якія вы паставілі, то абвяшчаўся выйгрыш. У тым выпадку, калі яны выйшлі разам, грошы траплялі банкамёту. Калі ж выходзіла толькі адна, а другая трапляла ў наступную выкладку, то тады стаўка трапляла гульцу. Надалей пры жаданні стаўкі можна было падвойваць, або перасоўваць на іншую карту[28].

Фараон не патрабаваў ведання правіл і ўмення, усё залежала толькі ад поспеху. Натхняльнай была сама атмасфера, якая панавала падчас гульні. Вакол стала збіралася значная колькасць ахвотных і ўвесь час адбываліся пэўныя выплаты. У выніку людзей захоплівала сама атмасфера і ўпэўненасць у выйгрышы.

Распаўсюджанне азартных гульняў прыводзіць да таго, што гульня ў карты магла прыносіць значны прыбытак ці станавіцца прычынай істотных страт[29]. Так, Міхал Рэйтан з-за сваёй любові да картаў пазбавіўся сваёй часткі маёнтка Беразова. Адпаведна з прывілеем караля Яна ІІ Казіміра ад 22 красавіка 1659 г., Марцін Рэйтан атрымаў Беразова (Полацкае ваяводства) у спадчыну з правам перадачы яго нашчадкам па мужчынскай лініі. Затым маёнтак перайшоў да яго сына Міхала Казіміра. У 1706 г. паводле тэстаменту апошняга ад 11 лістапада 1705 г. Беразова адышло да яго сына Дамініка. Па прывілею караля Аўгуста ІІІ ад 1736 г. яму было дазволена пераўтварыць вотчынны маёнтак Беразова ў мястэчка. Змены адбываюцца ў 1778 г. Яшчэ пры сваім жыцці Дамінік правёў падзел маёнткаў. Частка Беразова адышла да яго сына Міхала, якую той у 1779 г. прадае генерал-маёру Івану Міхельсону[30]. Трэба адзначыць, што і пасля гэтай падзеі Міхал Рэйтан працягваў бавіцца ў карты.

Элемент азартнасці прысутнічаў і ў такой гульні, як мар’яж. Асноўнае яе адрозненне палягае ў тым, што тут не рабілася высокіх ставак і існавала абмежаванне па колькасці гульцоў[31]. Гэтыя абставіны робяць яе папулярнай сярод жанчын, у тым ліку і ў асяроддзі Рэйтанаў[32], а таксама малама-

[28] Kitowicz J. Opis obyczajów za panowania Augusta III. S. 361–364.

[29] Ibid. S. 361.

[30] НГАБ, ф. 319, воп. 2, спр. 2716, арк. 16–16 адв., 25–25 адв.; Федорук А. Т. Старинные усадьбы Берестейщины. С. 20–23, 424–425; Aftanazy R. Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej. T. 2. S. 219–220; Mycielski M. Reytan Michał // PSB. T. XXXI. S. 230–231.

[31] У мар’яж маглі гуляць не болей за чатыры чалавекі і ставіць дазвалялася не болей за адзін злоты.

[32] З успамінаў Ганны Герыч з Рэйтанаў, якая памерла ў Парыжы ў 1857 годзе. С. 105, 113, 116.

ёмаснай шляхты[33].

Да азартных картачных гульняў адносяцца таксама квіндэч і ломбр[34], якія разам з астатнімі па сваёй прывабнасці і папулярнасці з канца XVIII ст. абганяюць гульню у косці, шахматы, більярд і інш.

Магнаты для стварэння свята не абмяжоўваліся традыцыйнымі днямі. Нагодай магла стаць любая падзея. Так, Караль Радзівіл «Пане Каханку» у адной з паездак у Варшаву запрасіў да сябе ў Нясвіж англічанку княжну Кінгстан. Дзеля гэтага было паклікана вялікая колькасць гасцей, сярод якіх і Міхал Рэйтан. Падчас вяселля паслалі за карлікам. Увечары Каролік спяваў і граў на арфе. Княжна-англічанка была настолькі ўражана, што выказала жаданне яго купіць, прапанаваўшы Рэйтану «1000 дукатаў золатам і 1000 дукатаў у дыяментах»[35].

У паўсядзённым жыцці абавязкі карліка былі досыць шырокія. Ён займаўся ўтрыманнем аптэчкі: «пад яго наглядам знаходзіліся розныя салодкія і запраўленыя алкагольныя напоі, канфіцюры, марынады, акрамя гэтага ён адказваў за сталовую і касцёльную бялізну, утрымліваючы ўсё ў парадку»[36]. Да таго ж, ён дапамагаў у падрыхтоўцы святаў, ягоным абавязкам было гатаванне дэсерту з садавіны. Займаўся карлік таксама паляваннем на птушак і рыбалоўляй, пазней гатаваў кансервы ці вэндзіў, што карысталася попытам у гаспадароў. «Летам і восенню збіраў ён грыбы», – паведамляе крыніца. Адказваў Каролік таксама за мёд і жоўты воск, з якога выраблях свечкі[37].

Яшчэ адным з відаў баўлення часу ў канцы XVIII ст. становіцца наведванне тэатру. У гэты перыяд прыватнаўласніцкі магнацкі тэатр выконваў збольшага забаўляльную функцыю. Блізкаць Рэйтанаў да роду Радзівілаў давала ім мажлівасць быць сталымі наведвальнікамі іх Нясвіжскага тэатру[38].

Шырокае распаўсюджанне мелі сяброўскія сустрэчы і візіты, якія ўспрымаліся як свайго роду барацьба з манатоннасцю і нязменнасцю. Візіцёры ўносілі нейкую разнастайнасць у хатні асяродак, знаёмілі з краёвымі і сусветнымі навінамі, падымалі новыя тэмы ў размовах. Гаспадары пачыналі турбавацца, калі на працягу некалькіх дзён іх ніхто

33 Kitowicz J. Opis obyczajów za panowania Augusta III. S. 362.
34 Ibidem; Kaczyński P. Od pijatyki do fête galante. Formy zabawy na dworach magnackich w XVIII wieku. S. 84.
35 З успамінаў Ганны Герыч з Рэйтанаў, якая памерла ў Парыжы ў 1857 г. С. 105.
36 Тамсама. С. 102.
37 Тамсама. С. 102, 103.
38 Тамсама. С. 103–104.

не наведваў. Так, Ганна Герыч згадвае, што яе бабуля з роду Камаровых у шлюбе Багдановіч вельмі любіла, калі да яе наведвалі госці, і нэрвавала, калі яны ад'язджалі. Сама Камарова мела для выездаў экіпаж і шэсць коней. Штодзённа яна ездзіла на шпацыр, кожны аўторак у Боркі на абед да эканома. Кожную нядзелю яна ездзіла ў Раманава на імшу.

Для падтрымкі традыцыі ўнучка з сяброўкамі займаліся інсцэніроўкай прыезду гасцей. «Мы з Мар'янай Мержаеўскай прыбіраліся, а дзеўкі тады паведамлялі:

— Ваша мосць, афіцэркі з Раманава прыехалі ў госці.

— І добра, што гэтыя афіцэркі прыехалі, будуць гуляць са мной у мар'яж сёння ўвечары»[39].

У межах такіх сустрэч замацоўваюцца новыя формы забаў, невядомых для сармацкай культуры. Да сталай гульні ў карты і размоваў дадаецца сумеснае спажыванне кавы[40], што ўваходзіць ва ўжытак толькі ў XVIII ст. Кава становіцца элементам шляхецкай матэрыяльнай культуры не толькі падчас сустрэч. У саміх Рэйтанаў яе спажывалі штодзённа. Гэта, як звычай, адбывалася «а чацвертай гадзіне папаўдні»[41]. Каву ўвогуле можна разглядаць у якасці альтэрнатывы алкагольным напоям. Таму з моманту яе з'яўлення ў нашым асяроддзі лічылася, што гэты напой садзейнічае паляпшэнню здароўя і ў аніякім разе не можа ўжывацца адначасова з алкаголем[42].

У паўсядзённым жыцці значнае месца займаў клопат аб захаванні пасагу і спадчынных рэчаў, што ў пэўнай ступені можна разглядаць таксама як адну з формаў прыватнага калекцыянавання.

Так, бабуля Герыч атрымала значны пасаг, а таксама каштоўныя рэчы. Сярод іх штофы[43], рубранты[44], дываны, футры, капы, тканыя залатымі шаўковымі ніткамі. Хавалася ўсё гэта ў вялікім гардэробе паміж дарагімі спадчыннымі рэчамі хатняга ўжытку. «Летам гэтыя рэчы вывешваліся на

[39] Тамсама. С. 116.

[40] Kaczyński P. Od pijatyki do fête galante. Formy zabawy na dworach magnackich w XVIII wieku. S. 70.

[41] З успамінаў Ганны Герыч з Рэйтанаў, якая памерла ў Парыжы ў 1857 г. С. 100.

[42] Kitowicz J. Opis obyczajów za panowania Augusta III. S. 242.

[43] Гаворка можа ісці пра шкляны посуд, які выкарыстоўваўся для захавання моцных спіртных напояў і адначасова з'яўляўся мерай вымярэння ёмістасці. Таксама штофам называлі цяжкую шаўковую ці шарсцяную тканіну з тканым малюнкам.

[44] Магчыма, перакручаны выраз «рэмбрандты», выкарыстаны аўтаркай успамінаў у значэнні «каштоўныя палотны», «мастацкія творы».

дзядзінцы для прасушкі і дзеля аховы ад молі»[45]. Гэтая падзея выклікала моцныя эмоцыі і выступала повяззю пакаленняў. Герыч праз усё жыццё пранесла памяць пра гэты факт: «Памятаю, што нам вельмі падабалася, калі гэтыя рэчы вывешвалі на сонейка» [46]. Традыцыя захавання спадчынных рэчаў атрымлівае паўсюднае распаўсюджванне. Так, у Шчоціне, у княскім доме, захоўвалася шмат гадоў адна жаночая сукенка, модная ў свае часы.

Некаторыя спадчынныя рэчы набываюць у шляхты статус музейных экспанатаў. Так, Камарова мела «вялікі кітайскі парцэлянавы пазалочаны чайнік. На ім былі намаляваныя пагады і хлопцы з зачасанамі валасамі ды завязаным пасярод галавы пучком»[47]. Агляд гэтага чайніка пераўтвараўся ў незвычайную з'яву. Паказвалі яго толькі далёкім і найбольш паважаным гасцям, пасля чаго ён хаваўся пад замок. Старая Камарова адносілася да гэтай рэчы, як да сямейнай рэліквіі і «ніколі… у гэтым чайніку [не – *В.Г.*] запарвалі каву ці гарбату»[48].

Свае асаблівасці ў правядзенні вольнага часу ўносілі поры года. Менш разнастайных забаў назіраецца ў вечаровы час узімку. Шляхцянкі рознага стану ў гэты час займаліся рукадзеллем. Яны шылі, вышывалі, плялі з белых тонкіх ніцяў сеткі, якія потым выкарыстоўвалі для ўпрыгожвання сваіх фрызур і аддзяння, вязалі[49]. Так, бабуля Ганны Герыч, якая мела ў падпарадкаванні лёкая, хатнюю прыслугу і трох дзяўчынак, узімку «сядзела на канапцы каля століка і вязала панчохі з шэрых грубых нітак, а потым раздавала іх паляўнічым, якія прыносілі ёй дзічыну»[50]. Рэлігійныя асобы сталага ўзросту маглі вырабляць што-небудзь для касцёльных патрэбаў: сціхары, арнаты і г. д. [51]

Свае забавы ўзімку мела моладзь і дзеці. Удзень яны часцей за ўсё бавіліся са снегам. Ганна Герыч сведчыць, «…як добра было выехаць на гэты стаў малымі санкамі, таму што ісці пехатой было складана, хоць і блізка, бо ногі пачыналі хутка мёрзнуць і трэба было бегчы да дому. А санкі былі добра засцеленыя, з добрым футрам пад нагамі, было гэта зручна, і таму санкі выкарыстоўваліся з вялікай радасцю»[52].

[45] З успамінаў Ганны Герыч з Рэйтанаў, якая памерла ў Парыжы ў 1857 г. С. 108.
[46] Тамсама.
[47] Тамсама.
[48] Тамсама.
[49] Kitowicz J. Opis obyczajów za panowania Augusta III. S. 358.
[50] З успамінаў Ганны Герыч з Рэйтанаў, якая памерла ў Парыжы ў 1857 г. С. 113.
[51] Kitowicz J. Opis obyczajów za panowania Augusta III. S. 358.
[52] З успамінаў Ганны Герыч з Рэйтанаў, якая памерла ў Парыжы ў 1857 г. С. 110.

Доўгімі вечарамі дзецям распавядалі казкі. Звычайна гэта рабіў хто-небудзь з пакаёвак, у Рэйтанаў гэта выконваў Каролік. Карлік «прыходзіў у пакой, які называўся паненскі, дзіцячы альбо кавярня, дзе распавядаў казкі, а казкі яго былі вельмі папулярныя, бо сабраў ён іх тады, калі жыў пры двары пані Салагубавай. Гэта былі гісторыі пра чарнакніжнікаў, пра чараўніц, пра заклятых каралеўнаў, пра трох сыноў – двух разумных і трэцім дурню і г.д.»[53].

У баўленні вольнага часу ў канцы XVIII ст. не назіраецца значных адрозненняў у колькасных і стылёвых аспектах не толькі ў параўнанні з усім стагоддзем у цэлым, але нават і з папярэднімі XVI і XVII ст. Колькасць забаў у асяродку заможнай шляхты па-ранейшаму застаецца дастаткова абмежаванай. Сюды можна аднесці святочныя ўрачыстасці, візіты і сяброўскія спатканні, разнастайныя гульні, інтэлектуальна-культурныя заняткі, клопат аб захаванні пасагу і спадчынных рэчаў, рукадзелле і інш. І тым не менш, у афарбоўцы і сутнаснай праяве забаў, якія займалі ледзь не ўвесь дзень заможнага шляхціца, назіраюцца істотныя змены. З імкнення да прыемнага баўлення часу паўстае эстэтычная зацікаўленасць да прыватнага тэатру. Сярод шляхты пачынае распаўсюджвацца новае ўспрыманне музыкі, любоў да спадчынных рэчаў пераўтвараецца ў калекцыянаванне, паўстае таксама цікавасць да літаратурнай творчасці. Усё гэта прыспяшае праявы новага культурнага перыяду – перыяду XIX ст.

[53] Тамсама. С. 106.